# Выстава «Буквары народаў свету»

Цэнтральнай падзеяй XIV Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, што праходзілі ў беларускай сталіцы 26–27 красавіка, стала выстава «Буквары народаў свету». Яе ўрачыстае адкрыццё адбылося ў першы ж дзень форуму і стала сенсацыяй. Уявіце сабе: дзве тысячы буквароў і азбук на шасцістах мовах! Такога Нацыянальная бібліятэка Беларусі яшчэ не бачыла. Аснову грандыёзнай экспазіцыі склалі экспанаты, дастаўленыя ў Мінск з Латвіі — і гэта толькі частка велізарнага збору старадаўніх кніг латышскага педагога, гісторыка, географа, перакладчыка, даследчыка і калекцыянера Юрыса Цыбульса. Госць з Латвіі прывёз рэдкія экспанаты, каб яны разам з ім паўдзельнічалі ва ўрачыстасцях, прысвечаных 400-годдзю першага беларускага буквара.



Так, першы ў свеце буквар стварылі нашы суайчыннікі. Ён быў надрукаваны ў 1618 годзе ў мястэчку Еўе, што ў 40 кіламетрах ад Вільнюса, у друкарні Віленскага Свята-Духава праваслаўнага таварыства. Кніга складалася з 52 аркушаў, у ёй былі арнаменты, што нагадвалі віленскія выданні Францыска Скарыны. Мяркуемы аўтар буквара — грамадскі дзеяч Мялецій Сматрыцкі. Чаму ён? Таму што праз год менавіта Сматрыцкі выдаў у гэтай друкарні сваю славутую «Граматыку».

Да нашага часу ніводнага экзэмпляра буквара на тэрыторыі Беларусі не захавалася. На шчасце, яны ёсць у Лонданскай бібліятэцы «Мідл Тэмпл» і ў Каралеўскай бібліятэцы Даніі. Намаганнямі намесніка дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, кандыдата культуралогіі Алеся Сушы тры гады таму кніга была вернута з нябыту, і сёння ў нас ёсць электронная копія гэтага шэдэўра. Разам з вялізнай калекцыю буквароў і азбук з усіх частак свету — Еўропы, Азіі, Амерыкі, Афрыкі, Аўстраліі і Акіяніі — наш буквар можна цяпер убачыць у Нацыянальнай бібліятэцы.

На адкрыцці выставы «Буквары народаў свету» прысутнічалі не толькі педагогі, культуролагі, знакамітыя літаратары і грамадскія дзеячы нашай краіны.



У Беларусь прыбылі славутыя вучоныя і даследчыкі з Расіі, Украіны, Польшчы, Вялікабрытаніі і іншых краін. Ганаровым госцем форума быў Юрыс Цыбульс. Пасля афіцыйнай часткі мерапрыемства наведвальнікі імгненна запоўнілі выставачную залу. Людзей цікавіла літаральна ўсё, і тлумачэнні ахвотна даваў сам спадар Цыбульс. Ён вёў экскурсію па выставе, шчыра расказваючы пра тое, якім шляхам і пры якіх абставінах да яго трапілі тыя ці іншыя рэдкія кнігі, у якіх кутках планеты дзеля гэтага яму давялося пабываць. Шчаслівіцы, якія змаглі ўбачыць у той дзень калекцыю буквароў, сцвярджаюць: гэта было сапраўды захапляльнае і незабыўнае падарожжа па краіне ведаў!

*Сысоева Святлана*